**ДзУК “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Духоўна-асветніцкі цэнтр “Вытокі”**

# *Архіепіскап Канстанцін (Хоміч)*



*/да 105-годдзя з дня нараджэння/*

*(11.11.1911 – 19.09.2000)*

шорт-ліст

Пінск, 2016

**Архіепіскап Канстанцін (Хоміч Канстанцін Андрэевіч)** нарадзіўся 11 лістапада 1911 года ў фальварку (хутару) Рог, каля вёскі Бобрык Пінскага павета Мінскай губерніі (зараз Пінскі раён Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і.

З 1920 года Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польшчы, а праваслаўныя прыходы аказаліся ў юрысдыкцыі Праваслаўнай царквы ў Польшчы. У 1929 годзе завяршыўшы вучобу ў Пінскім рэальным вучылішчы, Канстанцін Хоміч паступіў у праваслаўную Віленскую духоўную семінарыю, якую скончыў у 1935 годзе.

Пасля жаніцьбы на Аляксандры Кандрацьеўне Хацяновіч К.А. Хоміч быў пасвечаны 8 лютага 1936 года ў дыякана, а 28 лютага архіепіскап Палескі і Пінскі Аляксандр (Іназемцаў) пасвяціў яго ў іерэя. 9 сакавіка таго ж года свяшчэннік Канстанцін Хоміч быў прызначаны настаяцелем царквы Ражства Прысвятой Багародзіцы ў вёсцы Ахова Пінскага павета Палескага ваяводства. Пасля далучэння ў 1939 годзе Заходняй Беларусі да СССР Палеская і Пінская епархіі вярнуліся ў юрысдыкцыю РПЦ.

1 кастрычніка 1941 года быў назначаны настаяцелем Свята-Мікольскай царквы ў вёсцы Купяцічы Пінскага раёна, дзе служыў у перыяд нямецкай акупацыі. Свяшчэннік стараўся пазбягаць кантактаў з акупацыйнымі ўладамі. Яго жонка, па спецыяльнасці фельчар, працавала ў адкрытым у Купяцічах медпункце і забяспечвала партызан медыкаментамі, дапамагала выходжваць параненых. У пачатку ліпеня 1944 года па загаду нямецкіх улад іерэй Канстанцін Хоміч з жонкай і сынам былі адпраўлены ў Германію, аднак яны змаглі затрымацца ў Варшаве. Пасля падаўлення Варшаўскага паўстання нямецкімі войскамі сям'я свяшчэнніка была інтэрнаваная і знаходзілася ў канцлагеры да вызвалення савецкімі войскамі ў пачатку красавіка 1945 года. Па прыбыцці ў СССР быў затрыманы для праверкі яго дзейнасці ў перыяд нямецкай акупацыі. Толькі ў канцы 1954 года атрымаў магчымасць вярнуцца ў Купяцічы. Вырашальную ролю ў яго вызваленні адыгралі станоўчыя характэрыстыкі і сведчанні камандзіраў партызанскіх атрадаў.

28 лютага 1946 года Мінскі і Беларускі архіепіскап Васілій (Ратміраў) прызначыў свяшчэнніка Канстанціна Хоміча па просьбе вернікаў настаяцелем царквы Ражства Прысвятой Багародзіцы ў вёсцы Ахова Пінскага раёна. У маі 1947 года архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Данііл (Юзвьюк) ўзнагародзіў яго залатым наперсным крыжом. 21 красавіка 1950 года ўзведзены ў сан пратаіерэя. Свяшчэннік часта гутарыў з прыхаджанамі, быў прасты, шчодры, гасцінны, гатовы прыйсці на дапамогу ў цяжкіх абставінах.

25 студзеня 1956 года пераведзены Мітрапалітам Мінскім і Беларускім Піцірымам у горад Добруш Гомельскай вобласці ў якасці настаяцеля Свята-Мікалаеўскага малітвеннага дома. Тут дзякуючы яму быў дабудаваны храм. 4 верасня 1962 года архіепіскап Мінскі і Беларускі Варлаам (Барысевіч) перавёў пратаіерэя Канстанціна Хоміча ў Свята-Успенскую царкву ў вёсцы Краснае Гомельскай вобласці. Ва ўмовах ганенняў на Царкву разам з сям'ёй зведаў тут нямала нягод: яны былі вымушаны жыць ва ўзятым у арэнду былым куратніку.

У 1969 годзе пратаіерэй Канстанцін Хоміч аўдавеў. Па благаславенню архіепіскапа Мінскага і Беларускага Антонія (Мельнікава) 19 сакавіка наступнага года ігуменам Захарыям (Равінцом) у Жыровіцкім у гонар Успення Прысвятой Багародзіцы мужчынскім манастыры быў пастрыжаны ў манашаства з захаваннем імя Канстанцін. У той жа дзень прызначаны намеснікам Жыровіцкага манастыра. 25 чэрвеня 1970 года ўзведзены ў сан архімандрыта. У гэты час у манастыры знаходзіўся на спакоі архіепіскап Ермаген (Голубеў). Канстанцін звяртаўся за духонымі парадамі да схіархімандрыта Іаана (Маслава), які пражываў у манастыры. Сяброўскія адносіны скláліся ў Канстанціна з Мінскім мітрапалітам Антоніям (Мельнікавым); мітрапаліт часта наведваў манастыр для гутарак з намеснікам. Гэтыя зносіны захаваліся і пазней, калі мітрапаліт Антоній быў пераведзены на Ленінградскую кафедру. Штогод у сценах абіцелі праводзіліся гутаркі са святчэннаслужыцелямі Мінска-Беларускай епархіі па розных пытаннях пастырскай практыкі. У гады настаяцельства Канстанціна Жыровіцкі манастыр абнеслі цагляным заборам, адрамантавалі Успенскі сабор, пабудавалі гараж.

У 1980 годзе Канстанцін быў узнагароджаны 2-гім крыжом з упрыгожваннямі, у 1986 годзе ўдастоены права нашэння Патрыяршага крыжа ў сувязі з 50-годдзем святчэнніцкага служэння.

23 сакавіка 1987 года пастановай Свяшчэннага Сіноду РПЦ Канстанцін назначаны епіскапам Пінскім, вікарыем Мінскай епархіі. 12 красавіка таго ж года у мінскім у гонар Сашэсця Святога Духа кафедральным саборы архіерэйскую хіратонію Канстанціна ўзначаліў Філарэт (Вахрамееў), мітрапаліт Мінскі і Беларускі; у хіратоніі прымаў удзел мітрапаліт Швейцарскі Дамаскін (Папандрэў). Пасля стварэння 6 ліпеня 1989 года самастойнай Пінскай і Брэсцкай епархіі Канстанцін стаў яе правячым архіерэям. 19 лютага 1990 года ў сувязі з раздзяленнем епархіі і аднаўленнем самастойнай Брэсцкай кафедры Канстанцін быў прызначаны епіскапам Брэсцкім і Кобрынскім. 25 лютага 1995 года ўзведзены ў сан архіепіскапа.

У гады кіравання архіепіскапа Канстанціна ў Брэсцкай епархіі адкрыліся Афанасьеўскі мужскі манастыр у вёсцы Аркадзія Брэсцкага раёна, зараз у складзе горада Брэста (1996), і Праабражэнская мужчынская пустынь у вёсцы Хмелева Жабінкаўскага раёна (1999, зараз манастыр); колькасць прыходаў павялічылася ў два разы, былі пабудаваны 28 храмаў, сярод якіх – Васкрасенскі сабор у Брэсце (збудаваны ў гонар 50-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне), адноўлены Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор у Брэсцкай крэпасці. Па благаславенню архіепіскапа Канстанціна пры епархіальным упраўленні было створана місіянерскае брацтва “Подвижник”, якое стала выдаваць інфармацыйна-асветніцкую газету “Духовный вестник”. У 1999 годзе выйшаў №1 “Брестских епархиальных ведомостей”. Былі адчынены 60 нядзельных школ, наладжана духоўнае акармленне пацыентаў бальніц і зняволеных. Архіепіскап Канстанцін быў у ліку арганізатараў і ўдзельнікаў Міжнароднай навукова-багаслоўскай канферэнцыі, прысвечанай

400-годдзю Брэсцкіх царкоўных сабораў, якая адбылася ў Брэсце ў верасні 1996 года.

Быў узнагароджаны ордэнамі св. Уладзіміра 2-й ступені (1981) і св. Данііла Маскоўскага 2-ой ступені (1991).

Адпяванне архіепіскапа Канстанціна 22 верасня 2000 года ўзначаліў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Архіепіскап Канстанцін (Хоміч) быў пахаваны з паўночнага боку кафедральнага Свята-Сімеонаўскага сабору ў Брэсце.

У 2011 годзе ў Санкт-Пецярбургу выйшла кніга «Жизнь в молитве и любви» (Воспоминания об архиепископе Брестском и Кобринском Константине (Хомиче). Складальнік кнігі – Андрэй Канстанцінавіч Хоміч, сын архіепіскапа Канстанціна. Разам са сваёй жонкай, Лідзіяй Рыгораўнай, яны прыехалі у лістападзе 2011 у Пінск. У духоўна-асветніцкім цэнтры "Вытокі" цэнтральнай гарадской бібліятэкі адбылася прэзентацыя кнігі, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння архіепіскапа Канстанціна. Андрэй Канстанцінавіч пасля прэзентацыі падараваў ДАЦ "Вытокі" і пінскім бібліятэкам кнігі "Жизнь в молитве и любви». А.К.Хоміч у 2015 завяршыў работу над абноўленай рэдакцыяй кнігі пра свайго бацьку.

**Бібліяграфія:**

1. Жизнь в молитве [Архиепископ Константин] // Ступени. – 2011. - №4. – С. 28 – 32.
2. Жизнь в молитве и любви : воспоминания об архиепископе Брестском и Кобринском Константине (Хомич К.А.) / сост.А.К.Хомич, Н.М. Светличная.- [Б.М.] : [Б.И.], 2011.- 92с.
3. Ильенков, В. В молитве и любви / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. - 2011. - №90. - 11 лістапада. - С.1
4. Ильенков, В. Книга об отце Константине / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. – 2011.- 25 лістапада. – С. 12.
5. Ильенков, В. Партизанские батюшки / Вячеслав Ильенков // Пінскі веснік. - 2011. - №56. - 15 ліпеня. - С.2.
6. Константин (Хомич Константин Андреевич) // Православная энциклопедия. – Том 37. – С. 21 – 22.
7. Куницкий, П. Вспоминая архиепископа / Павел Куницкий // Вечерний Брест. – 2011. – 11 ноября. – С.2.
8. Саўчанка, М. Епіскап Брэсцкі і Кобрынскі / М. Саўчанка // Полесская правда. – 1991. – ноябрь.
8. Хомич А. «Жизнь в молитве и любви» : воспоминания об отце /Андрей Хомич // Пінскі веснік. – 2011. – 6 студзеня. – С. 4.

*Выканаўца: Баговіч Т.К., галоўны бібліятэкар духоўна-асветніцкага цэнтра "Вытокі"*
*кастрычнік, 2016*